# 9 КЛАС

**1. Вызначце і запішыце беларускія словаформы, прадстаўленыя ў фанетычнай транскрыпцыі.**

[м’іл’йарт] ____________________

[кл’аччатка] ____________________

[рашшчап’іц’] ____________________

[шатланцк’і] ____________________

[папуаск’і] ____________________

[кал’эск’і] ____________________

[апсал’утысцк’і] ____________________

[адйутанцк’і] ____________________

[шп’ійанаш] ____________________

[л’адз’аш] ____________________

[паткашчык] ____________________

[ц’в’эрц’] ____________________

**2. Устаўце літары *е*, *ё* ці *я* і запішыце назоўнікі ў форме роднага склону адзіночнага ліку. Абазначце націскныя склады.**

плац..ж — ____________________

мяц..ж — ____________________

кап..ж — ____________________



чарц..ж — ____________________

дубл..р — ____________________

граб..ж — ____________________

крап..ж — ____________________

руб..ж — ____________________

камуфл..ж — ____________________

саква..ж — ____________________

**3. Падкрэсліце словы, якія адпавядаюць прыведзеным азначэнням.**

1) Крыху адпіць, пакаштаваць — прыгубíць ці прыгýбіць?
2) Насыціць соллю — прысаліць ці прасаліць?
3) Жанчына-музыкант, што іграе на трубе — трубáчка ці трýбачка?
4) Прыгатаваны з сазана — сазанавы ці сазановы?
5) Які мае адносіны да скасавання шлюбу — разводны ці разводны?
6) Яйцо або прадмет, падобны на яго, які кладуць, каб несліся куры — паклáд ці пóклад?
7) Дрэвавая і кустовая расліна з разложыстымі галінамі і вузкім лісцем — вярбá ці вéрба?

**4. Устаўце прапушчаныя літары. З кожнага рада выпішыце слова, якое па сваім марфемным саставе адрозніваецца ад астатніх у гэтым радзе.**

1) ..гурок, ч..ўнок, п..рашок, ч..снок

____________________

2) варт..ўнік, кір..ўнік, чар..ўнік, сад..ўнік

____________________

3) д..дка, к..дка, кл..дка, л..дка

______________________________

4) м..нто, кр..со, пл..то, б..ро

______________________________

**5. Вызначце, у якіх словах маецца суфікс *-нішч-*.**

1) гумнішча;
2) жытнішча;
3) балацянішча;
4) бульбянішча;
5) капуснішча.

**6. Бацькі Машы зрабілі агароджу каля дома з часта ўбітых калкоў, бацькі Арцёма абгарадзілі свой участак плотам, зробленым з вузкіх драўляных планак, дзядуля Сашы зрабіў агароджу з бярвёнаў, а суседзі Эліны — з вертыкальных і папярочных жэрдак, пераплеценых прутамі лазы. Насупраць аднаслоўных назваў агароджы запішыце, хто якую пабудаваў.**

| Назвы агароджы | Хто пабудаваў |
|---|---|
| паркан | |
| тын | |
| частакол | |
| штыкетнік (шчыкетнік) | |

**7. Запішыце беларускамоўныя адпаведнікі выразаў з рускім словам *«жарить»*.**



жарить (мясо) ______________________________

жарить (сало) ______________________________

жарить (горох, семечки) ______________________________

**8. Узнавіце фразеалагізмы, дапісаўшы патрэбныя займеннікі.**

1) зарубіць ______________ на носе;
2) на ______________ капыл (перарабіць);
3) на ______________ лады;
4) не з ______________ рукамі;
5) паспытаць ______________ хлеба;
6) чуць на ______________ вушы;
7) як на ______________ ліха;
8) скінуць з ______________ ветхага Адама.

**9. Праспрагайце дзеясловы *абысці*, *браць*, *есці*, *жаць*.**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| я | | | | |
| ты | | | | |
| ён | | | | |
| мы | | | | |
| вы | | | | |
| яны | | | | |

10. **Запішыце мінімальныя кантэксты, у якіх сказ «Я пагавару з тваімі бацькамі» ў адным выпадку азначаў пагрозу, у другім — суцяшэнне.**

Пагроза: ______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

Суцяшэнне: ______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________